**В. С. Забродская**

# СЯДЗІБА М. К. АГІНСКАГА Ў ЗАЛЕССІ

За 12 км на паўднёвы ўсход ад Смаргоні на лініі Мінск – Гудагай знаходзіцца чыгуначная станцыя Залессе. Там з XVIII ст. валадарыў род Агінскіх. Маёнтак Агінскіх першапачаткова ўяўляў сабой драўляны, абтынкаваны на драўляным падмурку палац, вакол якога быў разбіты рэгулярны парк. Дарэчы, падмуркі менавіта гэтага будынка ў 1980-я гады выявіў беларускі археолаг Аляксандр Мікалаевіч Кушнярэвіч (цяпер доктар мастацтвазнаўства, прафесар кафедры гісторыі і сацыяльных навук Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта).

З 1802 г. уладальнікам маёнтка стаў Міхал Клеафас Агінскі – актыўны палітычны дзеяч і кампазітар, найбольш вядомы музычны твор якога – паланэз “Развітанне з Радзімай”, напісаны ў 1794 годзе. Так, новы палацава-паркавы ансамбль быў узведзены паводле праекта перспектыўнага і таленавітага архітэктара Міхала Шульца з удзелам архітэктара Пусэ і садоўніка Пеўзнера ў 1802–1805 гг. на свабоднай тэрыторыі паміж абалонай ракі Вілія і старой пабудовай.

Палац уяўляў сабой 1–2-павярховы мураваны Г-падобны будынак. Яго галоўны корпус меў сіметрычна-восевую кампазіцыю з 2-павярховымі бакавымі павільёнамі і цэнтральнай мансардавай часткай, вылучанай 4-калоннымі дарычнымі порцікамі і вежачкай з гадзіннікам, якая мела завяршэнне ў выглядзе шара з гадзіннікавым звонам. Заходняе крыло галоўнага

фасада завяршалася 2-павярховымі павільёнамі, да якога прымыкалі дзве аранжарэі. Фасад адной меў паўкалоны і высокія арачныя вокны. Другая аранжарэя (“амерыканская”) размяшчалася перпендыкулярна да першай і мела на адным з фасадаў нахіленыя вокны. Паміж аранжарэямі быў сад. Непадалёк ад палаца пабудаваны мураваны 1-павярховы млын. Побач з палацам была ўзведзена 8-гранная капліца з драўляным дахам і вежачкай.

Пейзажны парк у рамантычным стылі быў разбіты на абалонах ракі за звярынцам. У звярынцы знаходзіліся дзве альтанкі: мураваная паўкруглая з 4-калонным порцікам, і мураваная круглая 2-павярховая, “кітайская”, з завяршэннем у выглядзе трох кветак. У парку былі ўстаноўлены памятныя камяніў гонар Т. Касцюшкі і першага губернёра Агінскага.

Дзякуючы таму, што на пачатку 2010-х аб’ект быў уключаны ў рэспубліканскую і абласную інвестыцыйныя праграмы, для яго аднаўлення былі прыцягнуты спонсарскія сродкі і сродкі трансгранічных праектаў. Пасля маштабных рэстаўрацыйных работ удалося аднавіць “Паўночныя Афіны”, як называлі сучаснікі сядзібу кампазітара, практычна ў тым выглядзе, якімі яны былі пры жыцці вядомага ўладальніка.

Так, у 2017 г. дзяржаўная гісторыка-культурная ўстанова “Музей-сядзіба М. К. Агінскага” стала лаўрэатам XIX Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу “Пазнай Беларусь” у намінацыі “Музей года”, заняўшы першае месца сярод усіх раённых (гарадскіх) музеяў Рэспублікі Беларусь.

Такое прызнанне, безумоўна, заслужанае, бо, як і шмат гадоў таму, сядзіба М. К. Агінскага сёння з’яўляецца культурным асяродкам, дзе праводзяцца не толькі экскурсіі па музеі і парку, але і арганізуюцца тэатралізаваныя экскурсіі, музейныя заняткі і лекцыі, канцэрты класічнай музыкі, праводзяцца балы, фестывалі, сярод якіх “Залессе запрашае сяброў”, які прымеркаваны да імянін жонкі М. К. Агінскага – Марыі Неры (першыя выходныя жніўня). Штогадова 25 верасня адбываюцца яскравыя ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды Дня нараджэння кампазітара “У госці да Міхала”.